Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

***Słownik białorusko-polski*, red. T. Chylak-Schroeder, J. Głuszkowska-Babicka, T. Jasińska-Socha // *Беларуска-польскі слоўнік*, рэд. Т. Хыляк-Шрэдар, Я. Глушкоўская-Бабіцкая, Т. Ясіньская-Соха, Warszawa 2012, 830 s.**

Recenzowany *Słownik…* został opracowany przez wykładowców Katedry Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, a inicjatorem i pomysłodawcą jego wydania był nieżyjący już profesor Albert Bartoszewicz. Przez długie lata nad publikacją pracował zespół pod kierunkiem profesora Aleksandra Barszczewskiego. Końcową redakcję słownika opracowały T. Chylak-Schroeder, J. Głuszkowska-Babicka i T. Jasińska-Socha.

Głównym źródłem materiału białoruskiego były dwa słowniki definicyjne, wydane na Białorusi w drugiej połowie ubiegłego wieku: obszerny, pięciotomowy *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы* pod redakcją K. Krapiwy (wyd. Mińsk 1977–1984) oraz *Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы* pod redakcją M. Sudnika i M. Kryuko (wyd. Mińsk 1996). Jak czytamy w *Przedmowie*, słownik „jest pierwszą publikacją leksykograficzną o rozmiarach zaspokajających potrzeby szerokiego grona odbiorców zainteresowanych polsko-białoruskimi kontaktami językowymi, w szczególności studentów, tłumaczy, dziennikarzy, handlowców. Zawiera ponad czterdzieści tysięcy artykułów hasłowych z uwzględnieniem najnowszej leksyki odzwierciedlającej zmiany, które zaszły w zasobie słownictwa białoruskiego zwłaszcza w ostatnich kilkunastu latach".

Istotnie, obok leksyki powszechnie używanej, autorki uwzględniły słownictwo o niższej frekwencji, między innymi z zakresu matematyki i rachunkowości, medycyny i anatomii, biologii, botaniki, leśnictwa i zoologii, chemii i farmacji, poligrafii, techniki, elektrotechniki i wojskowości, rolnictwa, górnictwa, geologii i mineralogii, architektury, fizyki i astronomii, lotnictwa, lingwistyki, filozofii, religii, sportu. W słowniku odnajdujemy leksykę odzwierciedlającą przemiany społeczno-ustrojowe ostatnich lat, między innymi: *грыль-бар* 'grill bar', *дамафон* 'domofon', *дубляж* 'dubbing', *дывелапер* 'deweloper', *джакузі* 'jacuzzi', *папарацы* 'paparazzo', *пін-код* 'kod PIN', *педафіл* 'pedofil', *процiракетная абарона* 'obrona przeciwrakietowa', *рэкламны постар* 'poster reklamowy', *сістэма супрацьракетнай абароны* 'tarcza antyrakietowa', *сурдапедагогіка* 'surdopedagogika', *тостар* 'toster, opiekacz', *фітнес-клуб* 'fitness club', *цунамі* 'tsunami', *шэф-повар* 'szef kuchni', *шматфункцыянальнае абсталяванне* 'urządzenie wielofunkcyjne', przy tym liczne hasła odnoszą się do nowych technologii informatycznych, por. *аб'ём памяці* inform. 'pojemność pamięci', *інтэрактыўны* inform. 'interaktywny', *інтэрнэт-сайт* inform. 'strona internetowa', *інтэрнэтчык* inform. 'internauta', *сістэмны адмiрыстратар* inform. 'administrator systemu', *файл* inform. 'plik', *электронны адрас* inform. 'adres elekroniczny'.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

Tak obszerny korpus leksykalny nie znalazł się w żadnym dotychczas wydanym słowniku białorusko-polskim: *Słowniku białorusko-polskim, polsko-białoruskim* T. Jasińskiej i A. Bartoszewicza (pierwsze wydanie: Warszawa 1996, drugie wydanie: Warszawa 2007), *Małym praktycznym słowniku biznesmena* T. Jasińskiej i N. Panasiuk (wyd. Warszawa 1995), *Słowniku dla dzieci białorusko-polskim, polsko-białoruskim* W. Żdanowicz (wyd. Mińsk 2006). Wszystkie przywołane publikacje nie spełniały całkowicie oczekiwań współczesnego odbiorcy: pierwszy i drugi ze względu na niską liczebność artykułów hasłowych (dwadzieścia tysięcy w obu częściach), ostatni – z uwagi na przeznaczenie dla wąskiego kręgu odbiorców.

Porównując dostępne na rynku słowniki białorusko-polskie, trudno oprzeć się wrażeniu, że są one niedoskonałe, a recenzowana publikacja znacznie się od nich różni. Przede wszystkim imponuje bogactwem zebranego w niej materiału. Czytelnik szukający pożądanego hasła nie tylko może wybrać spośród dwóch, a często i większej liczby synonimów (por. *абачлівы* 'ostrożny, rozważny, przezorny', *абгрунтаванне* 'uzasadnienie, dowód, argument, racja', *аблавух* przen. obelż. 'niezdara, ciamajda, tępak, niedołęga', *абзац* 'odstęp, akapit, ustęp', *абман* 'oszustwo, oszukaństwo, kłamstwo'), ale także prześledzić różne konteksty, w których dany wyraz występuje (por. *міфічны* mityczny, *~ы сюжэт* mityczny wątek, *~ая постаць* mityczna postać; *лагер*, ~а *m* obóz; *вучэбны ~* obóz szkoleniowy; *летні ~* obóz letni, kolonie letnie; *~для ваеннапалонных* obóz jeniecki; *канцэнтрацыйны ~* obóz koncentracyjny, łagier; *разбіць ~* rozbić obóz; *размясціцца ~ам* stanąć obozem). Mocną stroną słownika jest również prezentacja bogatej, białoruskiej frazeologii (zaczerpniętej między innymi ze *Słownika frazeologicznego białorusko-polskiego* A. Aksamitowa i M. Czurak; wyd. Warszawa 2000), por. *сабака – адчуваць сябе як пабіты ~* czuć się jak zbity pies; *вось дзе ~ закапаны!* tu jest pies pogrzebany!; *жыць як кот з ~ам* żyć jak pies z kotem; *як ~ на сене* jak pies ogrodnika; *твар – на ~ы напісана* wypisane na twarzy, *(не) да ~у* a) nie do twarzy, b) nie wypada, *~ свеціцца* twarz promienieje, *~ у ~ (~ам у ~, ~ам да ~у)* twarzą w twarz.

Autorki *Słownika…* uwzględniły także białoruskie warianty gramatyczne, fonetyczne i słowotwórcze, por. *зал // зала*, *замш // замша*, *топаль // таполя*; *гінóфіз // гінафíз*, *дóлар // даляр*, *неапрáўданы // неапраўдáны*, *цырáтавы // цыратóвы*; *атамнік // атамшчык*, *ватнік // ватоўка*, *выгарына // выгар*, *гніляк // гнілушка*, *голле // галлё*, *гоначнік // гоншчык*, *горкасць // горыч*, *гравіроўшчык // гравёр*, *грачаня // грачанё*, *грукатня // грукат*, *грыфон // грыф*, *ізумрудны // ізумрудавы*, *малпавы // малпіны*, *малярны // малярскі*, *прыстасавальнік // прыстасаванец*, *фасфарытавы // фасфарытны*, *фасфатавы // фасфатны*. Dla osób uczących się języka białoruskiego cenną pomoc stanowią również podawane w słowniku warianty końcówek fleksyjnych rzeczownika (por. *май – мая // маю*), a także osobliwości odmiany niektórych wyrazów (por. *Вялікдзень – Вялікадня*).

O wysokiej wartości praktycznej słownika stanowi także rozbudowana część gramatyczna. Użytkownik odnajdzie w niej informacje dotyczące fleksji wszystkich odmiennych części mowy. Przy rzeczownikach po tyldzie autorzy podają końcówkę do-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

pełniacza liczby pojedynczej, a w przypadku zmian fonetycznych także końcówki miejscownika, celownika liczby pojedynczej oraz dopełniacza liczby mnogiej, por. *броў// ка*, *~ўкі*, CMs *~ўцы*, Dlm *~вак*. Przy przesunięciach akcentowych między formami liczby pojedynczej i mnogiej podawana jest (w nawiasie okrągłym) końcówka mianownika i dopełniacza liczby mnogiej lub cały wyraz, por. *сястр//á*, *~ы* (lm *сёстр//ы*, *~аў // сясцёр*). Rzeczowniki dwurodzajowe są dodatkowo opatrzone końcówką narzędnika, por. *абдзірал//а*, *~ы*, CMs *~у*, N *~ам* m; CMs *~е*, N *~ай // ~аю*.

Przy czasownikach podawane są końcówki pierwszej, drugiej i trzeciej osoby liczby pojedynczej czasu teraźniejszego, a w przypadku zmian akcentowych także drugiej osoby liczby mnogiej; w formach nieregularnych uwzględniana jest ponadto trzecia osoba czasu przeszłego, por. *данéсці*, *~ясý*, *~ясéш*, *~ясé*, *~есяцé*, czas przeszły *~ёс*, *~éсла* dk (ndk *данóсіць*). Różnice w składni rządu czasowników polskich i białoruskich są sygnalizowane za pomocą pytań do odpowiednich przypadków gramatycznych, por. *вывуч//ыць*, *~у*, *~ыш*, *~ыць* dk (ndk *вывучаць*) 1. *чаму* lub z bezok. nauczyć, wyuczyć czego*; ~ыць рамяству* nauczyć rzemiosła 2. *што* nauczyć się *czego*.

Jako oddzielne hasła są traktowane przymiotniki, które przeszły w wyniki substantywizacji do klasy rzeczowników (por. *марожанае*, *цяжарная*, *шампанскае*). Przy liczebnikach głównych i zbiorowych jest podawana końcówka dopełniacza, por. *дванаццаць//ь*, *~і*; *двое, дваіх*. Przy przyimkach autorzy wskazują zakres ich użycia oraz osobliwości łączliwości z przypadkami gramatycznymi, por. *пад // пада* przyim. 1. z B. pod (pode) kogo–co przy oznaczaniu a) kierunku; *залезці пад стол* wejść pod stół b) przeznaczenia przedmiotu; *зямля пад бульбу* ziemia pod kartofle c) czasu; *пад вечар* pod wieczór. Przy spójnikach i partykułach podano objaśnienia dotyczące ich zróżnicowania funkcjonalnego, por. *але* 1. spójn. a) *przeciwstawny* lecz, ale 2. *part. wzmacniająca* (*w połączeniu z partykułą* ж *i następnym* i) ależ; *але ж і надвор'е* ależ pogoda.

Wysoka liczebność artykułów hasłowych, uwzględnienie przez autorki szerokiego kontekstu, a także rozbudowana informacja gramatyczna stanowią o wysokiej wartości użytecznej słownika. Wreszcie osoby uczące się języka białoruskiego mają możliwość korzystania z nowoczesnego, na miarę XXI w. leksykonu, bez odwoływania się – jak dotąd do słowników polsko-rosyjskich oraz rosyjsko-białoruskich jako pośredników. Niemniej jednak tak obszerna praca, jaką jest opracowanie słownika o wysokiej liczebności haseł, musiała wiązać się z drobnymi usterkami, które weszły do ostatecznej wersji słownika.

Tak zatem w pisowni niektórych wyrazów autorki nie uwzględniły reformy pisowni białoruskiej, która weszła w życia 1.09.2010 roku. Dotyczy to w pierwszej kolejności liczebników, które – po reformie – ujednolicono pod względem tzw. akania. Co prawda, w słowniku występują wprowadzone niedawno formy *дзявятка*, *дзявяты*, *дзявяцера*, *дзясятка*, *дзясяты*, *дзясяцера*, ale w publikacji odnajdujemy także liczebniki ilustrujące zapis graficzny sprzed reformy. Tak więc prawidłowe warianty to *а дзявятай гадзіне, пяцьдзясят, сямнаццацігадовы*, a nie zamieszczone w słowniku *а дзевятай гадзіне* (s. 25), *пяцьдзесят* (s. 589), *семнаццацігадовы* (s. 648). Ponadto – zgodnie z reformą – uproszczono pisownię grup spółgłoskowych w przymiotnikach

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

typu *баластны*, *кантрастны*. Formy te – zamieszczone w słowniku odpowiednio na stronach 122 oraz 350 – zastąpiono krótszymi *баласны*, *кантрасны*.

Niekonsekwentnie są podawane informacje dodatkowe przy wyrazach trudnych, mniej zrozumiałych dla czytelnika. Z oczywistych względów w publikacji nie znalazły się definicje takich wyrazów, jak *дэндрыт* 'dendryt', *еўгеніка* 'eugenika', *кубрык* żegl. 'kubryk', *невад* ryb. 'niewód', *рыпс* 'ryps', *суперфасфатны* 'superfosfatowy', *фаліянт* 'foliał', *феерычны* 'feeryczny', *фернамбук* 'fernambuk' czy *фасфарасцэнцыя* 'fosforescencja'; o ich znaczeniu czytelnik powinien wnioskować sam, a wskazówkę stanowią tu kwalifikatory. Słownik nie jest przecież definicyjny. Ale wytłumaczenie niektórych wyrazów wydaje się w pełni uzasadnione i wskazane. Zresztą same autorki niekiedy podają definicje haseł, a mianowicie tych, które są związane z kulturą prawosławną, realiami białoruskimi, kulturą wschodnią, por. *вянец cerk.* 'wieniec, korona' (*w cerkwi prawosławnej korona trzymana nad głowami nowożeńców podczas ślubu*). Nie jest to jednak reguła. Nie odnajdziemy dodatkowych informacji przy hasłach *іерэй cerk.* 'jerej', *каравай kulin.* 'korowaj'.

Brakuje kwalifikatorów między innymi przy hasłach *дэбіл* 'debil' (wulg.), *дэбільны* 'debilny' (wulg.), *рызнік* 'szmaciarz, gałganiarz' (pot.), *зрэбніца* 'ubranie ze zgrzebnego płótna' (arch.), *шалапут* 'nicpoń, urwis, szaławiła, szałaput' (pot.), ponadto przy niektórych artykułach hasłowych polskie ekwiwalenty nacechowane i nienacechowane stylistycznie są podawane bez kwalifikatorów w jednym szeregu, por. *абязлесіць* 'pozbawić lasów (neutr.), ogołocić z lasów (pot.)'; *праслязіцца* 'zalać się łzami (poet., górn.), rozpłakać się (neutr.)'. W kilku przykładach polski odpowiednik jest nietrafiony, por. *абдымк//і, з распасцёртымі -амі* 'z rozwartymi ramionami' (zamiast: *otwartymi*), *адправіцца на той свет* 'wyprawić się na tamten świat' (zamiast: *przenieść się*).

Pomimo drobnych usterek użytkownicy słownika z pewnością docenią jego wartość użyteczną. Środowisko polskich białorutenistów od lat czekało na ukończenie przez zespół pracujący przy Katedrze Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego wielkiego i jakże potrzebnego dzieła, jakim jest słownik białorusko-polski. Szacunek budzi fakt, że ten wieloletni trud zaowocował wydaniem leksykonu, który śmiało może się równać z najnowocześniejszymi słownikami, wydawanymi obecnie z Polsce. Ostateczny kształt publikacji znacząco podnosi także rangę samego języka białoruskiego jako języka nowoczesnego, zdolnego obsługiwać wszystkie sfery życia społecznego, a przy tym kwiecistego, o rozbudowanej frazeologii.

Agnieszka Goral

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

Alena Marková, *Sovětská bělorusizace jako cesta k národu: iluze nebo realita?* Wydawnictwo Lidové noviny, Praha 2012 r., 261 s.

Obecna sytuacja, kiedy większość Białorusinów nie używa do komunikacji codziennej języka białoruskiego, nie identyfikuje się z tradycyjnymi symbolami narodowymi, których używano przez krótki czas po ogłoszeniu niepodległości Białorusi w 1991 r., a nawet nie utożsamia się z białoruską narodowością opartą na białoruskim dziedzictwie kulturowym i historycznym oraz na białoruskim jako języku narodowym, prezentuje się w europejskim kontekście kulturowo-politycznym poniekąd niestandardowo. Początków tej sytuacji należy szukać u progu XX w.

Autorka recenzowanej monografii podejmuje próbę opisu polityki narodowościowej, której kurs znacząco wpłynął na rozwój dalszej białoruskiej historii.

Alena Marková postawiła sobie za zadanie wyjaśnienie przyczyn niepowodzenia procesu białorutenizacji oraz strategii politycznej, której celem była stabilizacja i wzmocnienie nowej władzy sowieckiej i państwa sowieckiego.

Proces białorutenizacji w latach 20. XX w. nosił wszelkie znamiona przejścia od grupy etnicznej do narodu, w jego ramach były wspierane działania prowadzące do powstania kompletnej struktury socjalnej, ustalenia granic, stworzenia systemu edukacji instytucji publicznych oraz kodyfikacji języka narodowego. W odróżnieniu od innych ruchów narodowościowych w Europie, gdzie procesy te przebiegały stopniowo, na Białorusi wszelkie założenia tego programu (opracowanie języka literackiego i specjalistycznego, rozwój kultury, konstrukcja tożsamości narodowej i rozwarstwienie społeczeństwa) były realizowane jednocześnie.

Pomimo podejmowanych starań język białoruski w trakcie tego procesu nie został ani symbolem narodowym, ani państwowym, zaś język rosyjski nadal pełnił rolę języka prestiżowego. Jedną z przyczyn niepowodzenia był fakt, że dla ówczesnych elit intelektualnych język białoruski nie był językiem ojczystym, a z kolei chłopi, stanowiący większość w społeczeństwie i używający do komunikacji codziennej języka białoruskiego, uważali język rosyjski za jedyny język literacki, którego znajomość potencjalnie ułatwi młodemu pokoleniu awans społeczny.

Jednak, jak twierdzi autorka, białorutenizacja przyniosła też pozytywne wyniki, do których należy zaliczyć m.in. wzrost liczby białoruskich szkół podstawowych, badań naukowych prowadzonych w języku białoruskim czy rozwój sztuki.

Ze względu na krótki okres trwania polityki białorutenizacji, nie udało się wprowadzić trwałych zmian w stosunku społeczeństwa do języka białoruskiego. Elita intelektualna używała języka białoruskiego tylko przez ograniczony czas. Już od początku lat 30. w sferze akademickiej rozpoczyna się stopniowe wprowadzanie języka rosyjskiego jako wykładowego; również w sferze administracji państwowej zaczyna pod wpływem ideologii przeważać język rosyjski. Inteligencja probiałoruska była atakowana i dyskredytowana. Wygaszanie polityki białorutenizacji przebiegało równocześnie z innymi zmianami społeczno-politycznymi, które rozpoczynały epokę totalitaryzmu.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

W zakończeniu monografii autorka stwierdza, że negatywny wpływ na proces białorutenizacji miały takie zjawiska, jak zrusyfikowanie środowisk miejskich, brak w pełni uformowanego społeczeństwa białoruskiego, krótki czas trwania białorutenizacji oraz zbyt niski status społeczny języka białoruskiego. Negatywny rezultat procesu białorutenizacji i jego późniejsze przerwanie mają jednak większe znaczenie i wychodzą poza ramy tego jedynego okresu w białoruskiej historii, wpływają również na sytuację dzisiejszą. Akutalnie na Białorusi trwają procesy rusyfikacyjne wypierające model tożsamości narodowej oparty na białoruskich elementach językowych i kulturowych.

Białoruska tożsamość narodowa charakteryzuje obecnie tylko nieliczną grupę probiałoruskiej inteligencji oraz opozycji politycznej, nie obejmuje zaś większej części społeczeństwa.

Zaznaczmy, że autorka recenzowanej monografii jest pracownikiem naukowym Wydziału Studiów Humanistycznych Uniwersytetu Karola w Pradze, prowadzi badania nad zagadnieniami sowieckiej historii, kształtowaniem narodu i tożsamości narodowej.

Tomáš Typovský

І. Гапоненка, Лексіка беларускай *літаратурнай мовы XIX – пачатку XX ст.: асаблівасці станаўлення і развіцця*, Мінск 2012, 306 с.

У параўнанні з некаторымі іншымі сферамі мовазнаўчай навукі – лексікаграфіяй, фаналогіяй, гісторыяй мовазнаўства, сацыялінгвістыкай і г.д., – лексікалогія ў сучаснай беларусістыцы падаецца дастаткова распрацаваным раздзелам. Так, створаны фундаментальныя акадэмічныя манаграфіі *Гістарычная лексікалогія беларускай мовы* (1970), *Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы* (1994), апублікаваны шматлікія даследаванні У. Анічэнкі, А. Баханькова, І. Будзько, А. Булыкі, В. Несцяровіча, Н. Паляшчук, К. Скурата і інш. Па нашых падліках, з агульнай колькасці ўсіх дысертацыйных работ, абароненых па беларускай мове ў Рэспубліцы Беларусь, амаль 40% у той ці іншай ступені закранаюць лексікалагічную праблематыку. Разам з тым, многія аспекты гістарычнай лексікалогіі, нягледзячы на ўсе відавочныя поспехі беларускага мовазнаўства, пакуль застаюцца *terra incognita* для айчыннай філалагічнай навукі.

Часткова гэты прабел ліквідаваны дзякуючы апублікаванай у Беларускім дзяржаўным універсітэце манаграфіі І. Гапоненкі. У кнізе вырашаецца шэраг пытанняў, важных для разумення механізмаў станаўлення нормаў беларускай літаратурнай мовы: праблема моўнай пераемнасці, прычыны і шляхі запазычвання лексікі з іншых моў, семантычныя працэсы ў беларускай мове, роля дыялектнай лексікі ў фарміраванні літаратурнай мовы, асаблівасці аўтарскага лексікону беларускіх літаратараў XIX – пачатку XX ст., спецыфіка функцыянавання анамастычнай лексікі ў мастацкай літаратуры і інш.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

Крыніцамі для даследавання паслужылі мастацкія і навукова-папулярныя тэксты Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Ельскага, К. Каліноўскага, Якуба Коласа, М. Косіч, Я. Станкевіча і інш., пераклады твораў Э. Ажэшкі, У. Гаршына, С. Жаромскага, М. Крапіўніцкага, А. Міцкевіча, А. Чэхава, Т. Шаўчэнкі, перыядычныя выданні „Homan", „Дзянніца", „Крапіва", „Наша Доля", „Наша Ніва", „Świetač", матэрыялы па геаграфіі і статыстыцы, гісторыі і этнаграфіі колішніх беларускіх губерняў.

Структура манаграфіі падпарадкавана вырашэнню пастаўленых пытанняў. У першым раздзеле вывучаюцца непасрэдныя і апасродкаваныя сацыяльна-эканамічныя фактары, якія паўплывалі на станаўленне лексікі беларускай мовы ў акрэслены перыяд і ў цэлым сталі маласпрыяльнымі для кансалідацыі беларускай нацыі, а значыць – і для развіцця нацыянальнай мовы. Да непасрэдных умоў аўтар слушна адносіць агульныя прынцыпы ў галіне моўнай палітыкі ў Расійскай Імперыі, стан кнігадрукавання, асаблівасці адукацыйнай сістэмы. Да апасродкаваных элементаў моўнай палітыкі, якія вылучаюцца і характарызуюцца ў даследаванні, аднесены склад насельніцтва, эканамічная, грамадска-палітычная і культурная сітуацыя ў краіне, а таксама дзяржаўная палітыка ў галіне канфесійнага рэгулявання.

У другім раздзеле сістэматызуюцца погляды беларускіх і ўкраінскіх даследчыкаў на прыроду і сутнасць адносін паміж старабеларускай і новай беларускай літаратурнай мовай. Супастаўляюцца меркаванні І. Будзько, Н. Вайтовіч, А. Жураўскага, І. Крамко, Я. Станкевіча, С. Струкавай, Г. Цівановай, Л. Шакуна, А. Юрэвіч, А. Яновіч, а таксама І. Біладзіда, Ф. Жылко, Г. Леўчанкі, А. Маскаленкі, В. Русаніўскага і інш. Аўтар займае пазіцыю, важную для асэнсавання агульнага працэсу развіцця беларускай нацыянальнай мовы. Ірына Гапоненка лічыць архаічным падыход, пры якім перыяд заняпаду старабеларускай мовы кваліфікаваўся „як літаральны і суцэльны абрыў моўных традыцый, перыяд XVIII ст. – як своеасаблівая лінгвістычная дзірка, пасля якога пачынаецца новы віток развіцця фактычна ад нулявой адзнакі" (с. 48), сцвярджае, што зародкі новай літаратурнай мовы выяўляюцца ўжо ў старажытны перыяд. Прыводзяцца статыстычныя звесткі, атрыманыя пры параўнанні лексічных дадзеных старабеларускага перыяду і перыяду першага беларускага адраджэння (на падставе аналізу часткі рэестра *Гістарычнага слоўніка беларускай мовы* і *Слоўніка мовы „Нашай Нівы"*).

Трэці раздзел прысвечаны вывучэнню запазычанняў у беларускай мове ў перыяд, калі, з аднаго боку, адсутнічалі выразныя стымулы для актыўнага кантактавання беларускай мовы з іншымі мовамі, а з другога – „ненармалізаваная беларуская мова была нічым не абароненая ад разнастайных стыхійных іншамоўных уплываў" (с. 60). Пласт запазычанай лексікі XIX ст. даследаваны на аснове аналізу *Слоўніка беларускай мовы* І. Насовіча (1870), мастацкіх твораў В. Дуніна-Марцінкевіча, ананімных і аўтарскіх публіцыстычных тэкстаў. Акрамя таго, дастаткова падрабязна апісаны розныя тыпы паланізмаў, русізмаў, украінізмаў,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

балтызмаў, лацінізмаў, галіцызмаў, германізмаў і спосабы іх фанетычнай, марфалагічнай і дэрывацыйнай адаптацыі ў беларускай мове.

Чацвёрты раздзел кнігі прысвечаны семантычным працэсам у беларускай мове XIX – пачатку XX ст. Аўтар аналізуе працэсы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі, развіццё пераносных значэнняў у агульнаўжывальнай лексіцы, ролю пісьменнікаў у фарміраванні сістэмы вобразна-пераносных значэнняў, а таксама разнастайныя семантычныя дэфармацыі з удзелам абстрактнай лексікі. Пад тэрміналагізацыяй І. Гапоненка традыцыйна разумее „ўвядзенне адзінак нетэрміналагічнага характару ў сферу спецыяльнай камунікацыі" (с. 123). Праўда, фактычны матэрыял, які быў у распараджэнні аўтара, аказаўся не вельмі ўдзячным для ілюстравання з'явы тэрміналагізацыі ў беларускай мове XIX – пачатку XX ст. Так, складана пагадзіцца, што ў канструкцыях „з беднаты і недастатку у Саратові застрэліўся пачтовы чыноўнік Слугін", „tolki našy biełarusy niejak… nie trymajucca hramady…", „…адкуль бярэцьца на сьвеце бяда, цямнота и неволя", „уси людзи у тым часи были ящэ надто ціомны…", „значыць цяперэшный порадок на сьвеци – гэто толькі безпорадок" выдзеленыя лексічныя адзінкі валодаюць спецыяным значэннем і могуць кваліфікавацца як тэрміны ці хаця б як протатэрміны. У цэлым паняцце тэрміна набывае сэнс толькі пры разглядзе яго ў межах пэўнай тэрмінасістэмы. Калі ўлічыць, што перыяд стварэння першых спроб тэрміналагічных слоўнікаў выходзіць па-за межы храналагічных інтарэсаў аўтара, то аб'ектыўна даследаваць тэрміналагізацыю ў беларускай мове – дастаткова складаная задача. Таму І. Гапоненка цалкам слушна адзначае, што „ў разглядаемы перыяд аб многіх пераасэнсаваннях… можна гаварыць толькі як [аб] патэнцыйных ці гіпатэтычных" (с. 129).

Разгледжаны ў манаграфіі матэрыял паказаў, што ў акрэслены прамежак часу семантычныя пераносы становяцца дастаткова пашыранай з'явай, а найбольшую схільнасць да семантычнай дэрывацыі выяўляюць канкрэтныя назоўнікі з прадметнай семантыкай: *гнездо* 'птушынае жыллё' → 'чалавечае жыллё', *каша* 'густая страва з круп' → 'неразбярыха'.

У даследаванні І. Гапоненка падрабязна вывучыла семантычныя працэсы, якія адбываліся з удзелам лексікі, запазычанай з польскай, рускай, украінскай, літоўскай, латышскай і іншых моў, а таксама вылучыла асноўныя фактары семантычнага ўздзеяння запазычаных лексем на беларускую мову: даўнасць і трываласць сувязей кантактуючых моў, грамадскі статус мовы-донара, стан семантычнай сістэмы мовы-рэцыпіента.

Сярод вывадаў, зробленых аўтарам на падставе вывучэння семантычнай характарыстыкі лексем пачатку XX ст. у параўнанні з сучаснай мовай, далейшай увагі даследчыкаў-лексіколагаў вымагаюць наступныя: а) семантыка слоў на працягу XX ст. вызначаецца пераемнасцю; б) эвалюцыя семантычнай сістэмы беларускай мовы на працягу XX ст. ішла ў бок дыферэнцыяцыі, а не абагульнення; в) натуральны ход працэсу эвалюцыйнага развіцця лексікі быў некалькі дэфармаваны ўздзеяннем пазамоўных фактараў.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

Пяты раздзел манаграфіі прысвечаны вывучэнню некаторых фрагментаў дыялектнага ўздзеяння на мову беларускіх выданняў XIX – пачатку XX ст. У ім сістэматызаваны прынцыпы ўключэння дыялектнай лексікі ў літаратурна-моўныя кантэксты, прааналізаваны семантычныя адрозненні знешне ідэнтычных дыялектных і літаратурных слоў і зроблена заканамерная выснова, што „дыялектная лексіка была вядучым прытокам у рэчышчы тагачаснага лексіка-семантычнага працэсу" (с. 196).

Шосты раздзел прысвечаны даследаванню адметнасцей аўтарскага лексікону Янкі Купалы і Якуба Коласа. Вывучаны запазычанні (русізмы і паланізмы) у дарэвалюцыйных тэкстах названых аўтараў, крыніцы і спосабы пашырэння лексікону (дыялектныя, вусна-размоўныя элементы, утварэнне наватвораў), асаблівасці выкарыстання пазаслоўнікавай лексікі.

Дастаткова падрабязна даследаваны ў манаграфіі асаблівасці функцыянавання анамастычнай лексікі ў мове беларускай мастацкай літаратуры XIX – пачатку XX ст. – антрапонімаў (імёнаў, прозвішчаў, псеўданімаў) і тапонімаў (айконімаў, гідронімаў, ад'ектонімаў, мікратапонімаў і інш.). Аўтар абгрунтавала ідэю, што на пачатку XX ст. анамастыкон беларускамоўных выданняў істотна пашырыўся як у плане колькаснай прадстаўленасці онімаў, так і за кошт павелічэння разнастайнасці онімных тыпаў (пачалі выкарыстоўвацца заонімы, тэонімы, урбонімы, эргонімы, гемяронімы, харонімы, фэстонімы і інш.). Асабліва падрабязна І. Гапоненка спынілася на разглядзе харонімаў і этнонімаў, паколькі менавіта гэтыя групы лексікі ва ўмовах адсутнасці ўзуальных беларускіх формаў уласных імён характарызаваліся найбольшай ступенню структурна-семантычнай варыянтнасці. Дэталёва вывучаны працэс станаўлення нацыянальных онімных формаў (тапонімаў, антрапонімаў) і асаблівасці іх словазмянення.

Манаграфія І. Гапоненкі *Лексіка беларускай літаратурнай мовы XIX – пачатку XX ст.: асаблівасці станаўлення і развіцця* стварае ўражанне глыбокага і поўнага даследавання, якое вытрымана ў класічных традыцыях акадэмічнай навукі, але ў той жа час вызначаецца наватарскім падыходам да аналізу і інтэрпрэтацыі моўных фактаў і таму з'яўляецца салідным укладам у развіццё беларускай гістарычнай лексікалогіі.

Дзмітрый Дзятко

С. Шахоўская, *Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця*, Мінск 2012, 258 с.

Беларуская анамастычная лексікаграфія ў другой палове XX–пачатку XXI ст. развіваецца надзвычай актыўна: па самых сціплых падліках за апошнія дзесяцігоддзі было выдадзена каля 90 тапанімічных і антрапанімічных слоўнікаў (як самастойных, так і інкарпараваных), разнастайных даведнікаў і падборак

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

онімнай лексікі. Наспела патрэба каталагізаваць наяўныя лексікаграфічныя выданні, сістэматызаваць прынцыпы апісання ў іх уласных імён, акрэсліць задачы анамастычнай лексікаграфіі на бліжэйшую перспектыву.

Манаграфія маладой беларускай даследчыцы Святланы Шахоўскай *Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця* з'яўляецца комплексным даследаваннем асаблівасцей станаўлення, складу і перспектыў важнай галіны айчыннай лексікаграфіі. Кніга наглядна адлюстроўвае ўвесь шматвекавы вопыт беларусаў па захаванні ў мове і каталагізацыі ў слоўніках разнастайных тыпаў імёнаў.

Манаграфія складаецца з пяці раздзелаў, у якіх падаецца сістэмны агляд беларускай тэарэтычнай лексікаграфіі; упершыню ўводзіцца і абгрунтоўваецца перыядызацыя гісторыі нацыянальнай анамастычнай лексікаграфіі, тэарэтычна асэнсоўваецца працэс яе станаўлення, абагульняюцца бібліяграфічныя звесткі пра беларускіх лексікографаў; вызначаюцца структурныя асаблівасці беларускіх анамастычных слоўнікаў і распрацоўваецца іх тыпалогія; акрэсліваюцца перспектывы развіцця беларускай анамастычнай лексікаграфіі, ствараецца праект першага электроннага слоўніка гідронімаў.

На думку аўтара, прыкладная лексікаграфія актыўна развіваецца ў сувязі з наяўнасцю разгалінаванай сістэмы онімаў, якую даволі складана адлюстраваць у адным выданні, у той жа час крытычны аналіз і сістэматызацыя наяўнай інфармацыі набывае асаблівую актуальнасць на фоне супярэчлівых тэндэнцый у разглядаемай навуковай галіне. С. Шахоўская аналізуе каля сотні лексікаграфічных прац і слоўнікаў другой паловы XX–пачатку XXI стагоддзя, вылучае і апісвае навуковыя канцэпцыі, якія ляжаць у іх аснове і вызначаюць мадэль апісання онімаў, сістэму памет, наяўнасць ці адсутнасць інфармацыйных зон; ажыццяўляе сістэматызацыю і класіфікацыю беларускіх анамастычных слоўнікаў паводле аб'екта лексікаграфічнага апісання, іх мега-, макра- і мікраструктуры.

Дзякуючы шырокаму ахопу бібліяграфічнай інфармацыі, працы С. Шахоўскай з архіўнымі матэрыяламі, дарэчнаму ўключэнню ў кнігу партрэтаў-фотаздымкаў, мы быццам на свае вочы бачым такіх вядомых асоб, як В. Ластоўскі, М. Суднік, М. Бірыла; гартаем старажытныя першадрукі Л. Зізанія і П. Бярынды, праглядаем *Славянскі іменаслоў* М. Марошкіна XIX стагоддзя, *Lud białoruski na Rusi Litewskiej* М. Федароўскага, перачытваем рукапісную картатэку Т. Мікалаева… Аўтар знаёміць і з сучаснымі лексікографамі – В. Лемцюговай, Г. Мезенкай, А. Рогалевым.

У выданні падрабязна апісваюцца лексікаграфічныя працы ад старажытнасці да нашых дзён, праводзіцца крытычны агляд манаграфій, слоўнікаў, дадаткаў да дысертацый і нават рукапісаў па прадмеце даследавання. У працы прааналізавана і выкарыстана больш за 90 лексікаграфічных крыніц, спіс літаратуры налічвае каля 400 пазіцый, што не толькі сведчыць пра глыбіню і адказны падыход да даследавання, але можа значна дапамагчы навукоўцам і студэнтам у тэматычным пошуку прац па лексікаграфіі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

Асноўная праблема, якую паспяхова спрабуе вырашыць аўтар – распрацоўка і метадалагічнае абгрунтаванне сістэмнай тэорыі лексікаграфічнага прадстаўлення онімнай лексікі ў розных тыпах анамастычных слоўнікаў. С. Шахоўская прапануе „ідэальную" мадэль слоўнікавага артыкула ў тапанімічным выданні. На наш погляд, больш дакладным было б выкарыстанне тэрміна „аптымальная" або нават „рэкамендаваная" мадэль, бо высновы, зробленыя навукоўцам адносна структуры слоўнікавага артыкула, не скіроўваюць у сферу ўяўнага, а наадварот слушна ўказваюць даследчыкам і лексікографам на тое, якім павінны быць слоўнікавы артыкул, каб паўнавартасна прадставіць лінгвістычны і экстралінгвістычны кампаненты апісваемага оніма. Так, С. Шахоўская рэкамендуе ўказваць варыянтныя найменні онімаў (што папярэджвае страту анамастычных адзінак), вытворныя ад іх адзінкі – назвы жыхароў і ад'ектонімы (кадыфікацыя якіх з'яўляецца вельмі важнай у сувязі з неўніфікаванасцю гэтых груп найменняў), неабходныя граматычныя паметы, а таксама звесткі пра рэаліі, названыя рэестравым словам – адміністрацыйна-геаграфічную інфармацыю пра паселішчы. У стварэнні мадэлі-ўзору слоўнікавага артыкула тапанімічнага выдання выяўляецца навукова-практычная значнасць манаграфіі і рэалізуецца прэскрыптыўная функцыя даследавання.

Святлана Шахоўская дакладна акрэслівае зону бліжэйшага развіцця сучаснай анамастычнай лексікаграфіі, звяртаючы ўвагу на пакуль адсутныя слоўнікі хранонімаў (уласныя назвы прамежкаў часу), эргонімаў (назвы дзелавых аб'яднанняў людзей), хрэматонімаў (уласныя назвы прадметаў матэрыяльнай культуры), імёнаў-мянушак. Аўтар карэктна ўказвае на неабходнасць ліквідацыі лакун у анамастычнай лексікаграфіі, запатрабаванасць распрацоўкі ўніфікаваных спосабаў фіксацыі ідэнтыфікатараў у слоўнікавых артыкулах і размежавання зоны ідэнтыфікацыі, намінацыі і экстралінгвістычнай інфармацыі, пажаданасць уключэння ў слоўнікі транслітарацыі рэестравых адзінак лацінскай графікай. Усё гэта – ідэі для найноўшых даследаванняў, падказка і штуршок да дзеяння для новых пакаленняў вучоных.

Нельга не абысці ўвагай дадатак да манаграфіі, які, несумненна, зацікавіць кожнага лексікографа-практыка. Табліца *Ступень лексікалізацыі беларускіх тапонімаў* наглядна прадстаўляе адлюстраванасць у 24 слоўніках астыонімаў, камонімаў, ад'ектонімаў, катайконімаў, патамонімаў, лімонімаў, гелонімаў, віконімаў, урбанонімаў, найменняў гарадскіх пасёлкаў, вадасховішчаў і водных каналаў па кожнай вобласці і раёне Беларусі. Акрамя гэтага, табліца выразна акрэслівае лакуны ў разглядаемай сферы. Так, адсутнічаюць слоўнікі віконімаў і ўрбанонімаў Брэсцкай вобласці, запатрабаваным з'яўляецца апісанне катайконімаў, віконімаў і ўрбанонімаў Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей. Хочацца спадзявацца, што ўзнятыя ў даследаванні С. Шахоўскай пытанні знойдуць сваё вырашэнне ў найбліжэйшы час.

Аўтар манаграфіі матывуе навуковую і сацыяльную значнасць стварэння слоўніка гідронімаў беларускай мовы, што з'яўляецца лагічным і чаканым

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 22/11/2026 10:51:38

вынікам гісторыка-тэарэтычных пошукаў С. Шахоўскай. Распрацоўка і падрабязнае апісанне праекта электроннага зводнага слоўніка беларускай гідранімічнай лексікі, прыведзенае ў манаграфіі, можа служыць узорам для кадыфікацыі іншых разрадаў онімаў і стварэння новых электронных слоўнікаў тапонімаў, тым больш, што на сучасным этапе развіцця прыкладной лінгвістыкі канстатуецца перавага менавіта электронных лексікаграфічных рэсурсаў.

Адна са станоўчых рыс манаграфіі, якая дапамагае атрымаць цэласнае ўяўленне пра прадмет даследавання, – лагічная і паслядоўная сістэматызацыя інфармацыі ў трыадзінстве тэорыі, гісторыі і практыкі. *Беларуская анамастычная лексікаграфія* з'яўляецца свайго роду малой энцыклапедыяй беларускай тапанімічнай і антрапанімічнай лексікаграфіі і павінна заняць належнае месца ў бібліятэцы кожнага лінгвіста. Важнасць манаграфіі ў тым, што поруч з уласна навуковай вартасцю яна мае безумоўную практычную карысць і можа выкарыстоўвацца ў якасці дапаможніка-даведніка па многіх пытаннях лексікаграфіі: яе гісторыі, тэорыі і практыкі.

Вольга Шыманская